# Дзеля моцнай і квітнеючай Бацькаўшчыны

## Станоўчая дынаміка развіцця культуры

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага Сходу Рэспублікі Беларусь рэгулярна праходзяць вучобу, падчас якой яны могуць засвоіць тую ці іншую важную галіну жыцця нашай краіны больш дэталёва. Ды, па словах старшыні Палаты прадстаўнікоў Уладзіміра Канаплёва, на ўласныя вочы ўбачыць усе яе дасягненні і недахопы.

Тэма апошняга такога мерапрыемства, якое прайшло ў Мінску 30 лістапада, гучала наступным чынам: "Сучасная культура Беларусі: стан і перспектыва яе развіцця".

**Увага парламентарыяў да гэтай тэмы невыпадковая. Адкрываючы пленарнае пасяджэнне, якое адбылося ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Уладзімір Канаплёў адзначыў, што дэпутацкі корпус павінен дэталёва разбірацца ва ўсіх пытаннях жыцця нашага грамадства — у тым ліку, і жыцця духоўнага. Да таго ж, менавіта ад народных абраннікаў непасрэдна залежыць тое, што, на думку спікера, з'яўляецца не менш важным аспектам развіцця культуры, чым фінансаванне гэтай галіны: удасканаленне заканадаўчай базы, якая павінна адпавядаць надзённым патрабаванням.**



Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага Сходу РБ Уладзімір Канаплёў, міністр культуры РБ Леанід Гуляка, старшыня Пастаяннай камісіі на адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе Уладзімір Здановіч.



У светлым фае Дома кіно.

**Гэты дзень дэпутацкай вучобы не толькі дазволіў парламентарыям болей даведацца пра беларускую культуру і наведаць найважнейшыя яе аб'екты, але, хочацца верыць, стане глебай для новых заканадаўчых ініцыятыў у Авальнай зале, дзе вырашаюцца важныя пытанні жыцця краіны, у тым ліку і на карысць нацыянальнай духоўнасці.**





Дэпутаты падчас наведвання Нацыянальнай бібліятэкі РБ.



Сапраўды, культурная праблематыка нярэдка трапляе ў поле прафесійнай увагі беларускіх парламентарыяў. Прыкладам, зусім нядаўна імі быў прыняты ў другім чытанні закон "Аб музеях і музейным фондзе", а неўзабаве дэпутаты засяродзяцца на пытаннях аховы гісторыка-культурнай спадчыны — існы на сёння закон патрабуе пэўных карэктываў, якія будуць улічаныя ў яго новай рэдакцыі.

У сваім дакладзе "Дзяржаўная культурная палітыка. Асноўныя напрамкі развіцця нацыянальнай культуры на сучасным этапе" міністр культуры Рэспублікі Беларусь Леанід Гуляка маштабна і шматбакова акрэсліў актуальны стан гэтай галіны. Падсумоўваючы сваё выступленне, міністр адзначыў: *"Вынікі работы галіны характарызуюцца станоўчайдынамікайасноўныхпаказчыкаўфункцыяніравання прафесійнага і аматарскага мастацтва, упарадкаваннемструктурыісеткіўстаноўіарганізацыйкультуры, удасканаленнемсістэмы падрыхтоўкікадраўкультуры, развіццём навукова-тэхнічнай дзейнасці".* І сціслы пералік дасягненняў беларускай культуры за апошні час, які папярэднічаў гэтаму сцверджанню, рабіў такую выснову абгрунтаванай.

Характарызуючы ролю культуры ў жыцці грамадства, Леанід Гуляка падкрэсліў: *"Беларуская культура ўносіць сур'ёзны ўклад як у фарміраванне ідэалогіі Беларусі, так і ў практыку ідэалагічнай работы, у аснове якой ляжыць прынцып сацыяльнайсправядлівасціікансалідацыіўсягонародадлядасягненнявысакароднаймэты—стварэннямоцнайіквітнеючайБеларусР'.*

Выступленне рэктара Беларускага дзяржаўнага інстытута праблем культуры Ірыны Багачовай стала своеасаблівай прэзентацыяй мультымедыйных выданняў, падрыхтаваных гэтай установай. Сёння іх лік ужо дасягнуў дзесяці, і з дапамогай гэтых кампакт-дыскаў можна падрабязна азнаёміцца з самымі рознымі праявамі беларускай культуры — ад іканапісу да сучаснага тэатра. У сваім дакладзе начальнік упраўлення аховы гісторыка-культурнай спадчыны Васіль Абламскі адзначыў важнасць кансалідацыі высілкаў суб'ектаў улады розных узроўняў дзеля захавання помнікаў архітэктуры — бо "зверху" вырашыць усе праблемы немагчыма. Ды падкрэсліў, што і дэпутаты, працуючы ў сваіх акругах, могуць зрабіць важкі ўнёсак у гэту пачэсную справу.

Агляд экспазіцыі Белдзяржмузея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, падчас якога парламентарыям спадарожнічалі кваліфікаваныя экскурсаводы, выклікаў у прысутных багата пачуццяў. Нягледзячы нават на тое, што, мусіць, усе яны наведвалі гэты музей далёка не ўпершыню. А ў якасці эксклюзіўнай "разынкі", падрыхтаванай адмыслова для VIP-гасцей, было знаёмства з каштоўнымі экспанатамі, якія захоўваюцца ў фондах.

## Малахітавы куфэрак і яго скарбы

Сярод пунктаў на культурнай карце Мінска, якія наведалі парламентарыі цягам свайго "вучэбнага" дня, было два канкрэтныя ўвасабленні тэндэнцый росту ў беларускай культуры. Абодва гэтыя аб'екты дзейнічаюць ужо вельмі даўно. Але зусім нядаўна да непазнавальнасці змянілі аблічча, атры-

*(Працягнастар.4)*



Дырэктра Нацыянальнай бібліятэкі РБ Раман Матульскі дэманструе арыгінальную канструкцыю стэлажу.

# Дзеля Моцнай і квітнеючай Бацькаўшчыны

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 3)

маўшы папраўдзе другое жыццё.

Па словах генеральнага дырэктара УП "Кінавідэапракат" Васіля Коктыша, з верасня 2005 г. Дом кіно ўжо наведала больш за 36 тысяч гледачоў. Гэтая ўстанова спалучае ў сваёй дзейнасці сацыяльна значныя праекты з паказам папулярных фільмаў.

Паколькі лепей адзін раз пабачыць, чым сто разоў пачуць, госці атрымалі магчымасць звездаць шыкоўныя тэхнічныя якасці Дома кіно на свае вочы ды вушы, стаўшы гледачамі і ўбачыўшы дакументальны фільм "Чырвоны д'ябал", зняты супольна беларускімі і расійскімі кінематаграфістамі. Выкшталцоная Dolby-сістэма стварала ўражанне поўнай далучанасці да падзей.

Не так даўно адкрыты пасля рамонту будынак Белдзяржфілармоніі, куды дэлегацыя парламентарыяў патрапіла напрыканцы вучобы, Уладзімір Канаплёў назваў не іначай, як "малахітавым куфэркам". І сапраўды, асацыяцыі з гэтым казачным прадметам цалкам дарэчныя. Куфэрак, якім бы ён ні быў каштоўным, адно прызначаны для захоўвання скарбаў, у дадзеным выпадку — духоўных. І ён не пустуе. Аб гэтым засведчыў выступ вядомага арганіста Канстанціна Шарава, што прадэманстраваў, як цудоўна гучыць Бах на аднаўленым філарманічным інструменце, а таксама святочны канцэрт, прымеркаваны да 70-годдзя Рэспубліканскага музычнага каледжа, магчымасцю наведаць які скарысталіся дэпутаты.



"Малахітавы куфэрак" ва ўсёй красе.



Падчас наведвання Белдзяржмузея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.



У Беларускай дзяржаўнай філармоніі гасцей сустракалі караваем.



Уладзмір Канаплёў віншуе Рэспубліканскі музычны каледж з юбілеем.

## "Прыемныя дробязі" маштабнага праекта

Калі ў філармонію і Дом кіно сёння можа патрапіць кожны ахвотны, наведванне новага будынка Нацыянальнай бібліятэкі стала сапраўднай эксклюзіўнай перлінай праграмы дня. Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў здолелі паназіраць за тымі інтэр'ернымі працамі, якія з максімальнай інтэнсіўнасцю вядуцца цяпер літаральна ў кожным яе кутку. А таксама атрымалі магчымасць дэталёва ўявіць, якой будзе бібліятэка пасля свайго адкрыцця. І пачулі абвяржэнне чутак пра "небяспечнасць" яе будоўлі з першых вуснаў — ад намесніка міністра культуры Уладзіміра Грыдзюшкі.

Сапраўды, лепш адзін раз пабачыць... Пакуль гэтыя памяшканні яшчэ не выклікаюць адчування абяцанага камфорту — ды і шумавы фон будоўлі даецца ў знакі. Але як толькі дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі РБ Раман Матульскі пачынае распавядаць пра тое, як будзе выглядаць гэтая прастора ў выніку, свядомасць ахвотна малюе ўтульныя і светлыя чытальні, невялічкія кавярні, шыкоўныя канферэнц-залы з мяккімі крэсламі і найсучаснейшым тэхнічным начыннем, адкрытыя пляцоўкі на розных паверхах, куды ўлетку можна будзе выйсці падыхаць паветрам нават з бібліятэчнай кніжкай у руках...

Грандыёзнасць новабуду выдатна дапаўняе функцыянальнасць і дэмакратычнасць гэтай установы — якую, дарэчы, здолеюць наведваць бадай усе ахвотныя, а не толькі студэнты старэйшых курсаў ды навукоўцы, бо брак плошчаў будзе цалкам пераадолены. Прысутныя здолелі пераканацца, што прадуманасць дробязей гэтага праекта адно падкрэслівае яго маштаб.

— Вельмі важна для нас было належна арганізаваць святло, — распавядае дырэктар бібліятэкі, засяроджваючы нашу ўвагу на невялікім і зусім непрыкметным пакойчыку. — Бо для кніг яно — смерць, а людзям надзвычай патрэбнае. Таму чытальныя залы былі размешчаныя ў самых светлых частках будынка. А вось прамежкавыя сховішчы — акурат у такіх анклавах, куды святло не трапляе.

Неўзабаве ён паказвае нам яшчэ адну "прыемную дробязь" — зручны стэлаж для часопісаў арыгінальнай канструкцыі: апошні нумар вонкі, а падшыўка — у адмысловай шуфлядзе. Ды з гонарам дадае, што гэтая рэч прыдумалася менавіта ў нетрах бібліятэкі — яе аналагаў нідзе не знойдзеш.

Дарэчы, мэбля і стэлажы, як і значная частка іншага бібліятэчнага "начыння", былі зроблены на Беларусі. Наяўнасць кан'юнктуры змусіла некаторыя прадпрыемствы засвойваць новыя для сябе віды вырабаў. Аднак на іх якасць скардзіцца не выпадае.

Хтосьці з прысутных адзначыў, што ў гэтую бібліятэку цалкам можна будзе хадзіць на экскурсію — а не толькі дзеля таго, каб там папрацаваць. Несумненна, менавіта так яно і станецца — асабліва ў першыя месяцы па адкрыцці новага будынка.

— Назіраючы за тым, як працуе тэлеліфт, нават самы сур'ёзны чалавек адчувае дзіцячае захапленне, — кажа Раман Матульскі, дэманструючы гэты складаны агрэгат — сапраўдны гонар новай бібліятэкі.



У музеі Уладзіміра Мулявіна.

## Плён вучобы — у практычнай дзейнасці

Праграма вучобы цягнулася куды болей за акадэмічны дзень — агулам яе працягласць перавысіла дзесяць гадзін. Аднак, сцвярджаючы, што гэты змястоўны экскурс у беларускую культуру быў для іх прыемны і карысны, парламентарыі, відавочна, выявілі не дыпламатычную ветлівасць, а сваю шчырую рэакцыю на ўбачанае.

Падсумоўваючы свае ўражанні ад багатага на падзеі дня, Уладзімір Канаплёў адзначыў:

— Заўжды прыемна спрычыніцца да культуры. Бо яна невычарпальная. Безумоўна, убачанае сёння можа выклікаць адно захапленне. Гэта красамоўнае пацверджанне эфектыўнасці дзяржаўнай палітыкі, і таму з гонарам думаеш, што ў дасягнутых выніках ёсць пэўная заслуга і дэпутатаў. Вядома, праблем у галіне культуры таксама хапае, аднак яны вырашаюцца! Думаю, гэтая вучоба будзе вельмі карыснай для дэпутацкага корпуса. Як вы, напэўна, заўважылі, нашы парламентарыі — гэта не проста пасіўныя гледачы. Іх усё цікавіць, яны з ахвотаю задаюць пытанні, каб спазнаць прадмет глыбей.

І сапраўды, дэпутаты былі мала падобнымі да звычайных экскурсантаў, няспынна дэманструючы сваю цікаўнасць да ўсяго ўбачанага, выказваючы прапановы, спараджаючы спантанныя дыскусіі. Ёсць усе падставы меркаваць, што спазнанае падчас вучобы стане крыніцай пэўных канкрэтных захадаў з боку беларускай заканадаўчай улады. Прыкладам, дэпутат Іван Талкачоў, апавядаючы карэспандэнту "К" пра свае ўражанні, выявіў гатоўнасць звярнуць увагу парламентарыяў на неабходнасць узмацнення матэрыяльна-тэхнічнай базы Белдзяржмузея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Па яго словах, гэтая ўстанова, якая адыгрывае важную ролю ў патрыятычным выхаванні моладзі, патрабуе абнаўлення. Бо вельмі важна, каб змест экспазіцыі гэтага музея раскрываўся, у тым ліку, і з дапамогай найноўшых дасягненняў тэхнікі. Яе спалучэнне з добрымі традыцыямі нашай культуры парламентарый адзначыў у якасці выдатнай рысы наведаных у дзень вучобы ўстаноў:

— З вялікай радасцю пабываў у Доме кіно пасля другога нараджэння гэтага будынка. Мяркую, цяпер там месціцца папраўдзе важны цэнтр культуры. Істотна тое, што "дыямент" Нацыянальнай бібліятэкі стане таксама і вялікім ды шматфункцыянальным сацыякультурным цэнтрам. Але асабліва хацелася б адзначыць даступнасць гэтых аб'ектаў — бо іх дзверы адчыненыя абсалютна для ўсіх грамадзян.

Наш кар.

Фота Андрэя СПРЫНЧАНА